НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
## ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.

*У дзвюх кнігах*

Кніга 1

Мінск
«Беларуская навука»
2011

УДК 94(476)"17/20"
БКК 63.3(2Беи)
Г51

Аўтары:

А. А. Каваленя, М. У. Смяховіч, М. П. Касцюк, А. Ф. Вялікі, В. В. Даніловіч, М. Г. Жылінскі, А. Н. Жытко, М. М. Забаўскі, У. В. Здановіч, Т. В. Грышкевіч, І. І. Дрывень, В. М. Жук, С. В. Зенчанка, У. Ф. Ладысеў, В. Г. Мазец, Я. П. Насытка, М. Б. Несцяровіч, Н. Я. Новік, М. С. Сташкевіч, С. А. Талмачова, У. В. Тугай, А. У. Унучак, А. М. Філатава, С. М. Хоміч

Рэдакцыйная калегія:

А. А. Каваленя (галоўны рэдактар), М. У. Смяховіч (намеснік гал. рэд.), В. Ф. Голубеў, В. В. Даніловіч, М. Г. Жылінскі, М. М. Забаўскі, М. П. Касцюк, М. Б. Несцяровіч, А. М. Філатава, А. А. Яноўскі, Э. С. Ярмусік

Рэцэнзенты:

доктар гістарычных навук прафесар А. М. Люты, доктар гістарычных навук прафесар Я. К. Новік, доктар гістарычных навук прафесар У. Н. Сідарцоў

*Выданне падрыхтавана ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» (навуковы кіраўнік праграмы – доктар гістарычных навук прафесар А. А. Каваленя). Заданне «05» – «Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў геапалітычных працэсах XIX–XX стст.» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук дацэнт М. У. Смяховіч)*

Г51 **Гісторыя** беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 584 с.

ISBN 978-985-08-1309-1.

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі раскрыты гістарычныя перадумовы і заканамернасці працэсу нацыянальнага самавызначэння беларускага народа; адлюстраваны шлях ад узнікнення ідэі дзяржаўнасці да фарміравання нацыянальнага самавызначэння; раскрыты шлях ад выспявання ідэі дзяржаўнасці і станаўлення нацыянальнага руху ў перыяд, калі беларускія землі знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі; асветлены гістарычныя формы развіцця беларускай дзяржаўнасці, якія склаліся ў 1918–1939 гг.

Разлічана на настаўнікаў, прафесійных вучоных-гісторыкаў, студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, супрацоўнікаў аддзелаў ідэалагічнай работы мясцовых адміністрацый, творчую інтэлігенцыю, шырокае кола чытачоў, неабыякавых да айчыннай гісторыі; рэкамендуецца для выкарыстання ў навукова-даследчай працы і ў вучэбным працэсе.

**УДК 94(476)"17/20"**
**БКК 63.3(2Беи)**

**ISBN 978-985-08-1309-1 (кн. 1)**
**ISBN 978-985-08-1308-4**

© Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2011
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2011

# ЗМЕСТ

**Уводзіны** ........ 5

Раздзел I. **Гістарыяграфія і крыніцы** (*Т. Грышкевіч, І. Дрывень, А. Жытко, М. Забаўскі, М. Касцюк, В. Мазец, Н. Новік, М. Смяховіч, С. Талмачова, А. Унучак, А. Філатава*) ........ 14

Раздзел II. **Дзяржаўна-прававы статус беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі** ........ 62

2.1. Усталяванне расійскай сістэмы кіравання (*С. Зенчанка*) ........ 62

2.2. Самакіраванне ў беларуска-літоўскіх губернях (*Т. Грышкевіч, І. Дрывень, А. Жытко, С. Талмачова*) ........ 79

Раздзел III. **Нацыянальнае развіццё і нацыянальная палітыка** ........ 145

3.1. Этнічная тэрыторыя, сацыяльны і этнаканфесійны склад насельніцтва (*Я. Насытка*) ........ 145

3.2. Станаўленне індустрыяльнага грамадства і нацыянальнае развіццё як геапалітычны працэс (*М. Касцюк*) ........ 162

3.3. Нацыянальная палітыка расійскага ўрада ў пачатку XX ст. (*Н. Новік*) .. 177

Раздзел IV. **Ідэя беларускай дзяржаўнасці і нацыянальны рух** ........ 196

4.1. Пытанне дзяржаўнасці ў геапалітычных працэсах і грамадскім жыцці беларуска-літоўскіх зямель (канец XVIII ст. – сярэдзіна 60-х гадоў XIX ст.) (*М. Смяховіч, А. Філатава*) ........ 196

4.2. Ідэйныя плыні грамадскай думкі XIX – пачатку XX ст. Заходнерусізм і краёвасць (*С. Мянчэня*). ........ 227

4.3. Вызначэнне праблемы беларускай дзяржаўнасці ў праграмных дэкларацыях грамадскіх рухаў у канцы XIX ст. (*М. Сташкевіч*) ........ 234

4.4. Пытанне беларускай дзяржаўнасці ў праграмах і дзейнасці палітычных партый і арганізацый у пачатку XX ст. (*М. Сташкевіч*) ........ 243

4.5. «Наша Ніва» і беларуская нацыянальная ідэя (1906–1915 гг.) (*А. Унучак*) 259

4.6. Праблемы аўтаноміі беларуска-літоўскіх губерняў у перыяд выбараў і дзейнасці расійскай Дзяржаўнай думы (1906–1917 гг.) (*М. Забаўскі*) ...... 274

4.7. Беларускі нацыянальны рух ва ўмовах Першай сусветнай вайны (жнівень 1914 – люты 1917 г.) (*С. Хоміч*) ........ 297

Раздзел II

# ДЗЯРЖАЎНА-ПРАВАВЫ СТАТУС БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

## 2.1. Усталяванне расійскай сістэмы кіравання

**Тэрытарыяльна-адміністрацыйнае ўладкаванне.** Па першым падзеле Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі адышла тэрыторыя плошчай 83 тыс. км$^2$, на якой жылі 1 млн 225 тыс. чалавек. Мяжа з Рэччу Паспалітай праходзіла па Заходняй Дзвіне і Дняпры[1]. Далучаныя беларускія землі было вырашана падзяліць паміж новаўтворанымі Магілёўскай і Пскоўскай губернямі. Для вызначэння межаў Пскоўскай і Магілёўскай губерняў і падзелу іх на правінцыі адпаведна вялікарасійскаму ўзору землямеры ў верасні – снежні 1772 г. нанеслі занятую тэрыторыю на карты. Карты правінцый выконваліся на падставе вынікаў першай пагалоўнай рэвізіі. У сакавіку – снежні 1773 г. спецыяльная экспедыцыя Акадэміі навук на чале з І. Ляпёхіным вызначыла геаграфічныя каардынаты мясцовасці, што служыла падставай для яе дакладнага картаграфавання. Але згаданыя мерапрыемствы не закранулі размеркавання тэрыторыі паміж вызначанымі адміністрацыйнымі адзінкамі. Аднак трэба адзначыць, што пасля першага падзелу працэс уключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі і ўсталявання на далучаных землях расійскай адміністрацыі быў доўгатэрміновым і складаным. Першыя крокі расійскія ўлады накіравалі на тое, каб замацавацца на далучанай тэрыторыі. Дзеля гэтага праводзілася секвестраванне зямель шляхты, якая не прыняла прысягі, і раздача іх расійскаму дваранству, якое павінна было стаць апорай Расійскай імперыі на далучаных землях.

У 1772 г. створана Беларускае генерал-губернатарства з цэнтрам спачатку ў Магілёве, а затым у Віцебску. Новы адміністрацыйны падзел унутры губерняў будаваўся на аснове вынікаў пагалоўнай рэвізіі. Гэта значыць, памеры адміністрацыйных адзінак вызначаліся колькасцю рэвізскіх (мужчынскіх) душ, аб чым З. Чарнышоў дакладваў Сенату 1 чэрвеня і 24 ліпеня 1773 г. Адпаведную структуру спачатку атрымалі губерні. Магілёўскую губерню стварылі 4 правінцыі: першая – Магілёўская, другая – Аршанская, трэцяя – Рагачоўская, чацвёртая – Віцебская[2]. Беларуская частка Пскоўскай губерні павінна была складацца з дзвюх правінцый: Полацкай і Дзвінскай. У Пскоўскую губерню ўвайшла частка Полацкага ваяводства, а з Віцебскага – тыя землі, якія знаходзіліся па правы бок Дзвіны[3].

---

[1] Гісторыя Беларускай ССР. Т. 1. С. 444.

[2] Белоруссия в эпоху феодализма. Минск, 1961. Т. 3. С. 25.

[3] Тамсама.



Кацярына II, імператрыца Расійскай імперыі, 1762–1796 гг.

На далейшую адміністрацыйную перабудову вялікі уплыў аказала Установа для кіравання губернямі 1775 г. У прыватнасці, тая рэформа ўводзіла двухузроўневую сістэму кіравання (губерня – павет), без правінцыі. Для ліквідацыі валакіты і дубліравання грамадзянска-крымінальных спраў у адной і той жа ўстанове меркавалася аддзяліць адміністрацыю ад суда. Кожнаму месцу прыпісалі функцыянальныя абавязкі, а тэрытарыяльна-адміністрацыйныя адзінкі вызначылі ў стандартных велічынях, па колькасці рэвізскіх душ. Губерня мелася складацца з 300–400 тыс. душ, павет – з 20–30 тыс. душ. Правінцыі на паветы сталі дзяліць упершыню на тэрыторыі Беларусі[1].

Напярэдадні і ў час рэалізацыі рэформы 1775 г. паўстала пытанне аб мэтазгоднасці далейшага аб'яднання ў складзе Пскоўскай губерні новадалучанай тэрыторыі з вялікарускамі правінцыямі, на якія не распаўсюджваліся выключэнні з так званых польскіх правоў. 24 жніўня 1776 г. З. Чарнышоў прапанаваў аддзяліць рускія правінцыі ад беларускіх, пакідаючы разам з тым «обывателей новоприсоединенных Белорусских провинций на всемилостевейше пожалованных им правах и привилегиях». Кацярына II ухваліла гэту ідэю, і таму

[1] *Анішчанка Я. К.* Беларусь у часы Кацярыны II. Мінск, 1998. С. 58.

з Дзвінскай, Полацкай і Віцебскай правінцый утваралася асобная губерня з цэнтрам у Полацку[1].

Пры адзначанай рэарганізацыі няпростым аказалася вызначэнне рэзідэнцый павятовай адміністрацыі, бо гэта патрабавала выкупу прыватнаўласніцкіх мястэчак і перапланіроўкі сёл. І тое і другое вымагала значных сродкаў. Хуткасці рэформы перашкодзілі падараванні дзяржаўных уладанняў ва ўласнасць новым уладальнікам і зварот іх у рукі папярэдніх трымальнікаў. Складанасці вынікалі і ў сувязі з тым, што адна Магілёўская эканомія займала практычна ўсю тэрыторыю адпаведнай правінцыі.

Пры рэалізацыі рэформы З. Чарнышоў зыходзіў з няроўнасці Пскоўскай і Магілёўскай губерняў у падатковых адносінах. Каб дасягнуць жаданага адзінства, ён раіў перавесці Віцебскую правінцыю ў склад Магілёўскай губерні з усімі трыма паветамі (Віцебскім, Веліжскім і Гарадокскім) – усяго 85 615 хрысціян і 2633 яўрэяў, або 88 248 акладных душ[2].

10 студзеня 1778 г. была заснавана Магілёўская губерня ў складзе 12, а новая, Полацкая, – 11 паветаў[3]. Быў цалкам ліквідаваны Гомельскі павет, пасля таго як аднайменнае мястэчка трапіла ў падараванне Л. Румянцаву. Перабудова не закранала Аршанскага, Магілёўскага, Мсціслаўскага, Рагачоўскага, Сенненскага і Чэрыкаўскага паветаў. Змяніліся рэзідэнцыі 6 паветаў. З Быхава кіраванне перанеслі ў Чавусы (у апошнім на той момант было 1057 жыхароў), са Шклова – у Стары Быхаў (1235 душ), з Мілаславічаў – у Клімавічы (906 чалавек), з Чачэрска – у Беліцу (235 чалавек). На месцы Дубровенскага ўтвараліся Капыскі (1025 душ) і Бабінавіцкі (70 душ) паветы.

У новай Полацкай губерні Чарнышоў рэарганізаваў тры паветы. З Марыенгаўзена павятовая адміністрацыя перамяшчалася ў Люцын (201 душа). Полацкі павет падзяляўся на Полацкі (у горадзе тады было 904 душы) і Дрысенскі (44 чалавекі). На месцы Гарадоцкага з'явіліся Гарадоцкі (141 душа ў горадзе) і Суражскі (адпаведна 312 чалавек) паветы. 13 снежня 1776 г. З. Чарнышоў атрымаў санкцыю на правядзенне прадугледжанага дзялення. 22 сакавіка 1777 г. Сенат канчаткова ўхваліў новыя штаты. 4 ліпеня намеснік паведаміў аб завяршэнні пераразмеркавання паветаў, а 11 жніўня і 9 лістапада 1777 г. прадставіў адпаведныя карты губерняў і паветаў. У адпаведнасці з рэарганізацыяй новыя губерні або намесніцтвы мелі наступныя характарыстыкі. Новаўтварэнні ўжо мелі аднастайныя па колькасці рэвізскіх душ паветы. У такім выглядзе Магілёўскае намесніцтва было з помпай адкрыта 4 чэрвеня, а Полацкае – 28 мая 1778 г.

Не адразу пасля далучэння былі ўстаноўлены цэнтры новаўтвораных губерняў і праведзены межы паміж імі. З. Чарнышоў вагаўся пры выбары цэнтра Пскоўскай губерні. 20 чэрвеня 1772 г. ён раіў будучаму пскоўскаму губернатару

---

[1] *Никотин Н. А.* Столетний период (1772–1876) русского законодательства в воссоединенных от Польши губерниях и законодательство о евреях (1649–1876): в 2 т. Вильно, 1886. Т. 1. С. 1.

[2] *Анішчанка Я. К.* Беларусь у часы Кацярыны ІІ. С. 59–60.

[3] *Никотин И. А.* Столетний период (1772–1876) руского законодательства в воссоединенных от Польши губерниях и законодательство о евреях (1649–1876). Т. 1. С. 9.

М. Крачэтнікаву наладзіць новы парадак кіравання шляхам пераезду з Полацка ў Віцебск. А 8 кастрычніка 1772 г. намеснік пісаў Кацярыне II, што хаця цэнтрам губерні абрана Апочка, аднак губернскую канцылярыю ён загадаў да вясны 1773 г. паставіць у Полацку, а затым ужо перавесці яе. Яна была абрана ў якасці губернскага горада, таму што знаходзілася ў цэнтры губерні. У 1776 г. з Пскоўскай губерні вылучаны беларускія паветы, на базе якіх утворана Полацкая губерня. З 1778 г. Магілёўская і Полацкая губерні называліся намесніцтвамі[1].

У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 г. да Расіі адышлі землі: ад Друі, што знаходзілася на левым беразе Заходняй Дзвіны, да Нарачы і Дубравы, ідучы па мяжы Віленскага ваяводства на Стоўбцы праз Нясвіж, потым на Пінск[2]. Расійская імперыя заняла 92 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 1,3 млн чалавек. У тым жа маніфесце царскі ўрад гарантаваў свабоду веры, недатыкальнасць уласнасці па прыкладзе жыхароў беларускіх губерняў. Указам ад 13 красавіка 1793 г. Кацярына II прызначала на пасаду генерал-губернатара трох новаўтвораных губерняў М. Крачэтнікава. Яму даручалася размеркаваць занятыя землі пад Мінскую, Ізяслаўскую і Брацлаўскую губерні. Губернатарам Мінскай губерні прызначаўся генерал-маёр І. Няплюеў. Пры гэтым Кацярына II раіла далучыць да Полацкага намесніцтва рэшткі Полацкага ваяводства, да Магілёўскага намесніцтва – рэшткі таго ж ваяводства да ракі Бярэзіны, а Мазырскі павет размеркаваць паміж Чарнігаўскай і Кіеўскай губернямі. У спіс першачарговых мерапрыемстваў уваходзіла картаграфаванне тэрыторыі, перапіс насельніцтва, прывядзенне жыхароў на вернападданасць незалежна ад іх стану, назначэнне вярхоўнай расійскай адміністрацыі з дапушчэннем у яе мясцовых выхадцаў[3].

З мая 1793 г. па загадзе імператрыцы было створана Мінскае намесніцтва ў складзе Бабруйскага, Барысаўскага, Вілейскага, Дзісенскага, Ігуменскага, Мазырскага, Мінскага, Пінскага, Рэчыцкага і Слуцкага паветаў[4]. Такое дзяленне існавала працяглы час без істотных змен. Толькі ў снежні 1842 г. Вілейскі і Дзісенскі паветы ўвайшлі ў склад Віленскай губерні, а Наваградскі павет быў далучаны да Мінскай губерні. Новыя павятовыя цэнтры часта засноўваліся на месцы секвестраваных маёнткаў парушальнікаў вернападданай прысягі. У поўнай адпаведнасці з рэскрыптам імператрыцы М. Крачэтнікаў правёў картаграфаванне далучаных зямель разам з суцэльным апісаннем крыніц даходаў.

Канцылярскіх служачых было загадана наймаць з маларасійскіх, Тульскай, Калужскай і іншых губерняў[5]. У сувязі з недахопам рускіх чыноўнікаў Кацярына II дазваляла прызначаць у новаўтвораным намесніцтве добранадзейных мясцовых жыхароў, якія мелі сялян. Ад выбараў адхілілі тых, хто трымаў

[1] Гісторыя Беларусі. Т. 4. С. 50.

[2] Сборник документов, касающихся административного устройства Северо-западного края при императрице Екатерине II (1792–1796). С. 9.

[3] *Анішчанка Я. К.* Інкарпарацыя. Літоўскія правінцыі ў падзелах Рэчы Паспалітай. С. 291.

[4] *Смородский А. П.* Столетие Минской губернии 1793–1893. Минск, 1893, С. 25.

[5] *Никотин И. А.* Столетний период (1772–1876) русского законодательства в воссоединенных от Польши губерниях и законодательство о евреях (1649–1876). Т. 1. С. 10.

чужыя маёнткі ў якасці залогу і арэнды. Без уліку канцылярскіх служачых увесь адміністрацыйна-судовы апарат губерні налічваў 723 чалавекі, з якіх на долю мясцовых ураджэнцаў выпадала 500 месцаў. Акрамя гэтага, пры кожнай уладнай структуры меліся расійскія вайскоўцы, з-за чаго ўвесь урадавы штат губерні налічваў 962 чалавекі. Мясцовыя выхадцы займалі ва ўсіх органах кіравання каля паловы пасад[1]. Назначэнні на гэтыя пасады адбыліся ў жніўні 1795 г. Адным з першых крокаў царскага ўрада было правядзенне генеральнай люстрацыі ўладанняў з абмежаваннем уціску прыгонных. Губернскія ўлады заняліся разглядам прывілеяў гарадоў, рэвізіяй актаў Таргавіцкай канфедэрацыі, разлікам за паборы расійскіх воінскіх каманд[2].

Ц. Туталмін завяршыў распачатае М. Крачэтнікавым картаграфаванне далучанай тэрыторыі пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай. Гэта дало падставу размеркаваць зямельныя набыцці па аднастайным рэвізскім прынцыпе паміж 13 новастворанымі паветамі. Згодна з афіцыйным раскладам ад 14 мая 1795 г. Мінская губерня (намесніцтва) стваралася па штатах 1775 г. і з адпаведнымі адміністрацыйна-судовымі структурамі. Па выніках выбараў у розныя прысутныя месцы з 166 пасад 42 (25 %) занялі расійскія чыноўнікі, а астатнія – мясцовыя ўраджэнцы. Ц. Туталмін разаслаў адстаўных афіцэраў у якасці павятовых страпчых. 24 студзеня 1796 г. ён загадаў увесці ў склад кожнага суда перакладчыка з польскай мовы і абвясціў, што з 30 студзеня 1796 г. усе прысутнасці павінны весці справы на рускай мове, акрамя крымінальных працэсаў[3].

Па трэцім падзеле Рэчы Паспалітай у 1795 г. да Расійскай імперыі адышлі землі ад мяжы Валынскай губерні па рацэ Буг да Брэста і далей да мяжы Падляшша, адтуль па мяжы ваяводства Брэсцкага і Навагрудскага да р. Нёман і далей да мяжы з Прусіяй[4]. Кожная акруга давяралася брыгаднаму ці батальённаму камандзіру да часу назначэння цэнтраў паветаў з камендантамі гарадоў і капітан-спраўнікамі ў паветах. 28 чэрвеня 1795 г. у Гродне было адкрыта Вярхоўнае праўленне Літвы, якое складалася з 4 аддзяленняў (казённых, грамадзянскіх, эканамічных і крымінальных спраў), у якіх было 168 служачых і 132 чалавекі вайскоўцаў[5]. Вярхоўнае праўленне Літвы было пераходнай формай улады да таго часу, пакуль далучаныя тэрыторыі не былі ўніфікаваныя з агульнаімперскай адміністрацыйнай будовай. На месцах заставаліся земскія, гродскія суды, магістраты і ратушы.

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай рэшткі Вялікага Княства Літоўскага былі падзелены на тры часткі – Віленскую, Ковенскую і Гродзенскую – пад кіраваннем намесніка. Гэта тэрыторыя ўвайшла ў склад Слонімскага і Віленскага намесніцтваў. Віленскае – у складзе 11 паветаў (Ашмянскі, Новааляксандраўскі (Браслаўскі), Віленскі, Вількамірскі, Завілейскі, Ковенскі, Расіенскі,

[1] *Анішчанка Я. К.* Палітычная гісторыя ў часы падзелаў Рэчы Паспалітай. Мінск, 2000. С. 177.

[2] *Анішчанка Я. К.* Інкарпарацыя. Літоўскія правінцыі ў падзелах Рэчы Паспалітай. С. 307.

[3] *Анішчанка Я. К.* Палітычная гісторыя ў часы падзелаў Рэчы Паспалітай. С. 180.

[4] Сборник документов, касающихся административного устройства Северо-западного края при императрице Екатерине II (1792–1796). С. 73.

[5] *Анішчанка Я. К.* Палітычная гісторыя ў часы падзелаў Рэчы Паспалітай. С. 202–203.

Трокскі, Упіцкі (Панявежскі), Цяльшэўскі і Шавельскі) і Слонімскае – у складзе васьмі паветаў (Брэсцкі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Кобрынскі, Лідскі, Навагрудскі, Пружанскі, Слонімскі)[1].



Павел I, імператар Расійскай імперыі, 1796–1801 гг.

Значныя змены адбыліся ў адміністрацыйна-тэрытарыяльнай сістэме на беларускіх землях пасля ўзыходжання на прастол у 1796 г. Паўла I, які ў інтарэсах дзяржаўнай эканоміі 12 снежня 1796 г. ліквідаваў 7 губерняў і адну вобласць. Гэтыя скарачэнні закранулі і тэрыторыю беларуска-літоўскіх зямель. Было загадана з Полацкай і Магілёўскай стварыць адну Беларускую губерню, а з Віленскай і Слонімскай – Літоўскую, пры гэтым у першай губернскім горадам быў Віцебск, а ў другой – Вільня[2]. Літоўскім генерал-губернатарам быў генерал-фельдмаршал М. Рэпнін. Але прысутнічаў ён у краі толькі наездамі, бо займаў высокія пасады ў Пецярбургу[3].

У часы праўлення Паўла I, акрамя Беларускай губерні, якой кіраваў грамадзянскі губернатар, не меўшы над сабою вышэйшай мясцовай улады, ва ўсіх астатніх заходніх губернях галоўная ўлада належала ваенным губернатарам. Ваенныя губернатары мелі практычна тую ж уладу, што і генерал-губернатары. Толькі Літоўская губерня была аднесена па штатах да другога разраду, гэта значыць, што чыноўнікі атрымлівалі большыя аклады. Астатнія заходнія губерні былі аднесены да 1-га разраду[4].

15 студзеня 1797 г. быў выдадзены загад аб скарачэнні колькасці паветаў. У Літоўскай губерні пакінута тая ж колькасць паветаў, што былі зацверджаны яшчэ Кацярынай II. У Беларускай губерні ліквідавана 7 паветаў – Быхаўскі, Клімавіцкі, Капыскі, Бабінавіцкі (якія ўваходзілі ў склад былой Магілёўскай губерні) і Суражскі, Дрысненскі і Рэжыцкі паветы (уваходзілі ў склад былой Полацкай губерні)[5]. Да Мінскай губерні быў далучаны Рэчыцкі павет ад Чарнігаўскай губерні, да Пінскага павета – частка Луцкага павета Валын-

[1] Гісторыя Беларусі. Т. 4. С. 51.

[2] Тамсама.

[3] *Жукович П.* Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины // ЖМНП. 1914. № 2. С. 199.

[4] *Жукович П.* Западная Россия в период царствования императора Павла I // ЖМНП. 1916. № 6. С. 201.

[5] Тамсама. С. 193.

скай губерні. З 13 паветаў Мінскай губерні ліквідавана 4 (Пастаўскі, Докшыцкі, Нясвіжскі і Давыд-гарадоцкі). Такім чынам, Мінская губерня пры Паўле I складалася з 10 паветаў. У 1795 г. у Мінскай губерні налічвалася 4 833 433 душы мужчынскага полу. Колькасць жыхароў паветаў павялічылася да 40–50 тыс. душ. Калі не лічыць Магілёўскай губерні, то зробленае пры цараванні Паўла I скарачэнне паветаў у прасторах заходніх губерняў замацавалася надоўга[1].

Пасля смерці Паўла I указам Аляксандра I ад 27 лютага 1802 г. Беларуская губерня была падзелена на Віцебскую і Магілёўскую. Літоўская губерня загадам ад 9 верасня 1801 г. падзелена на Віленскую і Гродзенскую. Апошнюю складалі Брэсцкі, Гродзенскі, Ваўкавыскі, Кобрынскі, Лідскі, Навагрудскі, Пружанскі і Слонімскі паветы[2]. Новы адміністрацыйна-тырытарыяльны падзел абумоўліваўся тым, што вялікімі губернямі было цяжка кіраваць. Згодна з загадам ад 18 снежня 1842 г. у склад Гродзенскай губерні былі ўключаны Беластоцкі, Бельскі (аб'яднаны з Драгічынскім) і Сакольскі паветы. З ліквідаванай Беластоцкай вобласці Лідскі павет перададзены ў Віленскую губерню, Навагрудскі – у Мінскую[3].

Пасля падзелаў усе беларуска-літоўскія землі ўвайшлі ў склад двух генерал-губернатарстваў: Беларускага і Літоўскага. З 1823 па 1856 год існавала Віцебскае, Магілёўскае, Смаленскае і Калужскае генерал-губернатарства з цэнтрам у Віцебску, у склад якога з 1831 г. увайшла і Мінская губерня. У 1831 г. з яго складу была вылучана Калужская, а ў 1834 г. – Мінская губерня[4].

У Віленскае (былое Літоўскае) генерал-губернатарства ў 1831–1834 гг. уваходзілі Віленская і Гродзенская губерні. У 1834–1843 гг. да яго была далучана Мінская губерня. У 1843 г. са складу Віленскай губерні вылучана Ковенская, якая адносілася да таго ж генерал-губернатарства. Дадзеная тэрытарыяльная адзінка праіснавала ў такім выглядзе да 1856 г., калі была адасоблена Мінская губерня. Аднак у 1862 г. яна зноў увайшла ў склад Віленскага генерал-губернатарства. У 1863 г., у сувязі з паўстаннем, усе беларуска-літоўскія губерні ўвайшлі у склад Віленскага генерал-губернатарства. Толькі ў 1869 г. з-пад улады Віленскага генерал-губернатара выведзены Віцебская і Магілёўская губерні, а ў 1870 г. – Мінская. У 1863 г. была спроба далучыць да заходніх губерняў паўночна-ўсходнюю частку Царства Польскага – Аўгустоўскую губерню, з цэнтрам у Сувалках, якая межавала з Літвой. Восенню 1863 г. яна была падпарадкавана ў ваенна-адміністрацыйных адносінах Віленскаму генерал-губернатару[5]. Віленскае генерал-губернатарства праіснавала да 1912 г.

**Адміністрацыйнае кіраванне.** Прынцыпы адміністрацыйнага кіравання на далучаных беларуска-літоўскіх землях былі абумоўлены пастановай Сената ад 1773 г. «о должности уездных комиссаров». На момант іх далучэння штатна-

[1] *Жукович П.* Западная Россия в период царствования императора Павла I. С. 196.
[2] Гродненские губернаторы (1801–1917 гг.): документально-биографические очерки. Гродно, 2007. С. 12.
[3] Тамсама.
[4] Западные окраины Российской империи. С. 584.
[5] Тамсама. С. 183.

бюджэтны расклад адміністрацыйнай службы Расійскай імперыі існаваў без змен з 1763 г. З 1775 г. кіраванне на гэтых тэрыторыях усталёўвалася згодна з Установай (Установлением. – *С. З.*) для кіравання губернямі. Па дадзенай рэформе ўсе ўстановы і пасады дзяліліся на тры групы: адміністрацыйна-паліцэйскія, фінанансава-гаспадарчыя і судовыя. Першая група была прадстаўлена генерал-губернатарам, грамадзянскім губернатарам, ваенным губернатарам, губернскім праўленнем і прыказам грамадзянскай апекі, у павеце – земскімі спраўнікамі, ніжэйшым земскім судом і гараднічым. Існавалі наступныя фінансава-гаспадарчыя ўстановы: казённая палата ў губернях, казначэйства ў павеце[1].

У XIX – пачатку XX ст. інстытут генерал-губернатарства існаваў у асноўным на ўскраінах Расійскай імперыі, у тым ліку і на землях Беларусі і Літвы, якія належала інтэграваць у склад адзінай дзяржавы[2]. Генерал-губернатар прадстаўляў інтарэсы даручанага яму краю ў вышэйшых урадавых сферах і адначасова ўвасабляў яго сувязь з імперыяй. Інстытут генерал-губернатарства – інстытут палітычных прадстаўнікоў імператара ў найбольш буйных рэгіёнах. У яго галоўныя афіцыйныя функцыі ўваходзілі палітычны кантроль над губернатарамі, няўхільнае правядзенне палітыкі імператара ў правінцыі, каардынацыя дзейнасці чыноўнікаў розных міністэрстваў і ведамстваў на месцах. Генерал-губернатар быў вышэйшай уладай і лічыўся намеснікам імператара. Ён займаўся ўсімі адміністрацыйнымі справамі губерняў і з'яўляўся начальнікам войскаў, якія знаходзіліся на тэрыторыі Літвы і Беларусі[3]. У час знаходжання ў Пецярбургу засядаў у Сенаце, у трэцім дэпартаменце, да якога адносіліся справы губерняў, што знаходзіліся на прывілеяваным становішчы. Яму падпарадкоўваліся вайсковыя і грамадзянскія губернатары[4]. Фактычна ён валодаў неабмежаванымі паўнамоцтвамі.

У сувязі з нарастаннем палітычнай няўстойлівасці на заходніх ускраінах Расійскай імперыі генерал-губернатар атрымаў права ўводзіць ваеннае становішча, не атрымліваючы нават дазволу імператара[5]. Размежаванне паўнамоцтваў паміж генерал-губернатарамі і губернатарамі не знайшло свайго адлюстравання ва Установе для кіравання губернямі. Таму часта ўзнікалі непаразуменні паміж гэтымі двума прадстаўнікамі ўлады на губернскім узроўні. Генерал-губернатары займаліся палітычнымі справамі дзяржаўнай бяспекі, на губернатараў былі ўскладзены ў асноўным гаспадарчыя абавязкі.

Неабходнасць, пасля паўстання 1830–1831 гг., выпрацоўкі сістэмы мер, якія б садзейнічалі збліжэнню далучаных зямель з Расійскай імперыяй, прывяла цар-

[1] *Ерошкин Е. П.* История государственных учреждений дореволюционной России. М., 1983. С. 121.

[2] *Рассолов Г. А.* Институт генерал-губернаторства в Российской империи (1775 – кон. XIX в.): автореф. дис. ... канд ист. наук. М., 2005. С. 25.

[3] Национальные окраины Российской империи: становление и развитие системы управления. М., 1998. С. 199.

[4] Гісторыя Беларусі. Т. 4. С. 51.

[5] *Комзолова А. А.* Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. С. 43.

скі ўрад да стварэння ў пачатку 1832 г. Асобага камітэта па справах заходніх губерняў. У яго склад уваходзілі міністры ўнутраных і ваенных спраў, дзяржаўных маёмасцяў, асветы, фінансаў, обер-пракурор Св. Сінода і інш. Узначальваў гэты орган улады граф У. Качубей. Камітэт разглядаў праекты мерапрыемстваў у дачыненні да Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны, якія паступалі ад міністэрстваў, губернатараў і генерал-губернатараў, а пасля падаваў іх на зацвярджэнне імператару. У 1848 г. гэты камітэт спыніў сваю дзейнасць. Паводле яго рэкамендацый была спынена дзейнасць Статута ВКЛ 1588 г. і ўведзена агульнарасійскае заканадаўства, ажыццяўляліся мерапрыемствы па так званым разборы шляхты. За ўдзел у паўстанні студэнтаў і выкладчыкаў Віленскага ўніверсітэта гэту навучальную ўстанову ў 1832 г. закрылі. У 1836 г. забаронена выкладанне польскай мовы ў якасці асобнага прадмета ва ўсіх тыпах навучальных устаноў. Прымаліся захады па скарачэнні колькасці каталіцкіх манастыроў шляхам закрыцця некамплектных, была праведзена секулярызацыя царкоўных уладанняў, у 1839 г. скасавана ўніяцкая царква. У 1862 г. Заходні камітэт аднавіў сваю дзейнасць па разглядзе праектаў мерапрыемстваў, якія тычыліся кіраўніцтва заходніх губерняў. Аднак у снежні 1864 г. па рашэнні ўрада ён спыніў сваё існаванне, і выпрацоўкай палітыкі ў асноўным займалася Міністэрства ўнутраных спраў.

У кожнай губерні як выканаўчы орган дзейнічалі губернскае праўленне ў складзе «общего присутствия» і канцылярыі. Вышэйшы кіраўнічы орган – губернская канцылярыя – быў разбіты па галінах кіравання і на функцыянальныя часткі. Грамадзянскі губернатар з'яўляўся главой мясцовай адміністрацыі і паліцыі, выконваў агульны нагляд за ўсім апаратам кіраўніцтва і суда, чыноўнікамі і саслоўнымі органамі кіравання. Фармальна ён не ўмешваўся ў судаводства, але мог здзяйсняць уціск на судовыя рашэнні, прыпыняць выкананне прысудаў. Яму былі падпарадкаваны войскі на тэрыторыі губерні. Калі губернатар адсутнічаў, яго функцыі выконваў віцэ-губернатар[1]. Колькасць адміністрацыйных асоб была значна большай на далучанай тэрыторыі, чым у цэнтральных губернях, калі па штатах 1763 г. губернскае кіраванне складалася з 38 асоб, то па штатах далучаных зямель іх было 247 чалавек. Значнае павелічэнне колькасці чыноўнікаў прыпадала на фінансавыя ўстановы рознага роду, часткова на культурныя і лячэбныя. 9 кастрычніка 1772 г. Сенат падтрымаў прапанову З. Чарнышова аб падзеле губерняў на правінцыі. Правінцыяльныя канцылярыі ўзначалілі ваяводы (6-ы клас) з асэсарам (8-ы клас), пракурорам (8-ы клас) і двума сакратарамі. Дапаможны персанал пры ваяводах складалі пратакаліст, рэгістратар, 2 канцылярысты, 4 падканцылярысты, 4 капіісты, пераплётчык, 2 вартаўнікі і кат – усяго 21 чалавек. Пры кожным ваяводзе мелася 57 салдат аховы. З улікам трох правінцый у полацкай частцы Пскоўскай губерні пры ваяводзе было 63 цывільных служачых і 71 ваенны, а ў 4 правінцыях Магілёўскай – адпаведна 84 цывільных і 399 ваенных, або 546 усіх асоб. На ўсіх

[1] *Ерошкин Е. П.* История государственных учреждений дореволюционной России. С. 120.

выдаткоўвалася 3896 руб. Усе згаданыя чыны зацвярджаліся ў першым дэпартаменце Сената па асабістым хадайніцтве губернатараў і намесніка. Функцыянальна правінцыяльныя канцылярыі падпарадкоўваліся губернскім праўленням для рэалізацыі распараджэнняў паліцэйска-падаткавага значэння[1].

Калі ўся губернская адміністрацыя складалася з назначаных уладай чыноў, то павятовае кіраванне, абмінаючы пасаду гараднічага, які прызначаўся Сенатам, будавалася на выбарчай і саслоўнай аснове. Павятовая сістэма кіравання была прадстаўлена земскім спраўнікам, ніжнім земскім судом, гараднічым і казначэйствам, у якім працавалі чыноўнікі, што прызначаліся ўрадам. Паліцэйскія абавязкі ўскладаліся на ніжні земскі суд і камісараў. Галоўная мэта, якая ставілася перад земскім судом і камісарамі, – нагляд за захаваннем цішыні і спакою, вернасці манарху. Акрамя таго, на камісараў ускладаўся шырокі спектр абавязкаў: нагляд за дарогамі, мастамі і пераправамі; каб ніхто не парушаў устаноўленых мер вагі;назіранне за пажарнай і эпідэміялагічнай бяспекай у павеце; барацьба са злачынцамі, выкананне прысудаў і нагляд за калоднікамі; дапамога ў забеспячэнні ўсім неабходным ваенных каманд, якія праходзілі праз дадзеную мясцовасць; збор і перадача статыстычных звестак рознага характару[2].

Кожны павет падзяляўся на 6 ключоў на чале з войтам, якога выбіралі з асяроддзя землеўладальнікаў або іх эканомаў. Войтам падпарадкоўваліся сотнікі і дзясятнікі, якія выбіраліся сялянскім мірам. Сотнікі абіраліся ад 100–200 двароў, дзясятнікі – ад 1–25. Названыя асобы прызначаліся паліцэйска-выканаўчай уладай і былі падпарадкаваны павятоваму камісару як прадстаўніку царскіх улад у сельскай мясцовасці[3]. У гарадах гэтымі абавязкамі займаўся гараднічы. Паліцэйскія ўстановы былі неабходнымі для падтрымання парадку на далучаных тэрыторыях. Галоўным абавязкам мясцовай адміністрацыі з'яўляліся падтрымка правапарадку ў павеце і нагляд за своечасовым выкананнем павіннасцей[4].

Павел I зламаў усю сістэму мясцовага кіравання, створаную ў 1775 г. Ён адмяніў «Жалаваную грамату гарадам» 1785 года; ліквідаваў пасады намеснікаў; закрыў прыказы грамадзянскай апекі; правёў адміністрацыйна-тэрытарыяльную рэформу; гарадское саслоўнае кіраванне было аб'яднана з паліцыяй; гарадскія думы ліквідаваны[5].

Пасля паўстання 1830–1831 гг. у час кіравання Мікалая I змянілася палітыка расійскага ўрада адносна чыноўніцкага корпуса на беларускіх землях. Аднак спроба прыцягнення чыноўнікаў з унутраных губерняў імперыі, якія павінны былі стаць тут надзейнай апорай царскай улады, не прынесла поспеху,

[1] *Жукович П.* Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II. С. 298.

[2] Сборник документов, касающихся административного устройства Северо-западного края при императрице Екатерине II (1792–1796). С. 169–170.

[3] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. I. С. 271.

[4] Тамсама.

[5] *Барышкова К. В.*, *Подсумкова А. А.* История государственного управления и муниципального самоуправления России. М., 2008. С. 102.



Мікалай I, імператар Расійскай імперыі, 1825–1855 гг.

бо для іх урад не здолеў стварыць дастатковых матэрыяльных умоў. У 30–50-я гады XIX ст. сярэдняе і ніжэйшае чыноўніцтва беларускіх губерняў фарміравалася амаль выключна з мясцовых ураджэнцаў, пераважна дробнай шляхты каталіцкага веравызнання. З кіраўніцтва Мінскай губерні толькі 8 чалавек (25 %) прыехалі з Расіі і Украіны. Сярод сярэдняга і ніжэйшага чыноўніцтва гэты працэнт быў яшчэ меншым. З 77 канцылярыстаў казённай палаты толькі 3 пачалі службу на Украіне, усе 27 чыноўнікаў грамадзянскай судовай палаты былі мясцовымі ўраджэнцамі. На працягу 30–50-х гадоў XIX ст. царскі ўрад прыкладаў намаганні, каб павялічыць колькасць чыноўнікаў праваслаўнага веравызнання, у якіх царызм бачыў сваю галоўную апору. У канцы 50-х гадоў сярод кіраўніцтва Мінскай губерні праваслаўных было 8 (32 %), каталікоў – 16 (64 %), пратэстантаў – 1 (4 %)[1].

Такім чынам, і пасля 1831 г. чыноўніцкі корпус у беларуска-літоўскіх губернях фарміраваўся пераважна з мясцовых ураджэнцаў. Канфесійны склад чыноўніцтва быў абумоўлены канфесійнай структурай тых сацыяльных груп, з якіх ён фарміраваўся, і найперш шляхты. На працягу 30–50-х гадоў XIX ст. у Расійскай імперыі адбываўся працэс далейшага разрастання і бюракратызацыі мясцовага дзяржаўнага апарату, які суправаджаўся ўзнікненнем новых органаў мясцовага кіравання і паглыблення спецыялізацыі ўжо існуючых. Асабліва актыўна азначаны працэс бюракратызацыі праходзіў у беларуска-літоўскіх губернях, дзе пасля паўстання 1830–1831 гг. царскі ўрад не давяраў мясцоваму дваранству і рабіў стаўку на чыноўніцка-бюракратычны элемент. Аднак звышцэнтралізацыя імперскай сістэмы дзяржаўнага кіравання, адсутнасць рэальнага мясцовага самакіравання, якая адштурхоўвала грамадскія сілы, у тым ліку маладую буржуазію, ад удзелу ў вырашэнні задач мясцовага жыцця, рабілі дзейнасць дзяржаўнага апарату малаэфектыўнай, што яскрава засведчылі падзеі Крымскай вайны. Таму ў канцы 50-х гадоў XIX ст. перад імперскім кіраўніцтвам паўстала праблема радыкальнага рэфарміравання сістэмы мясцовага дзяржаўнага кіравання.

---

[1] *Токць С. М.* Асабовы склад дзяржаўнага апарату царызму ў Беларусі (30–60-я гг. XIX ст.) // Вес. АН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. 1996. № 2. С. 70–76.

У 1865 г. царскі ўрад рэарганізаваў унутраную структуру і парадак справаводства губернскіх праўленняў, у 1866 г. – казённых палат і палат дзяржаўнай маёмасці. У тым жа 1866 г. былі ўтвораны новыя губернскія ўстановы – кантрольныя палаты, абавязкам якіх з'яўлялася рэвізія фінансавай дзейнасці ўсіх дзяржаўных устаноў. Названыя пераўтварэнні не змянілі істотна характару дзейнасці мясцовага бюракратычнага апарату.

3 сакавіка 1864 г. быў выдадзены шэраг указаў, згодна з якімі чыноўнікам, што прыехалі ў «паўночна-заходнія» губерні з Расіі, было павялічана на 50 % жалаванне, аплачвалася дарога і выдаваліся пад'ёмныя грошы. 23 ліпеня 1865 г. у інструкцыі аб продажы дзяржаўных маёнткаў было запісана, што для прыцягнення чыноўнікаў «рускага паходжання» ў заходнія губерні і для «заахвочвання іх працягваць там службу» неабходна прадаваць ім на ільготных умовах дзяржаўныя землі. Права на такое набыццё зямлі мелі толькі чыноўнікі, якія прыехалі з унутраных губерняў, па прадстаўленні губернскага начальства аб іх «стараннай службе і абсалютнай добранадзейнасці ў палітычных адносінах»[1].

У 1866 г. у 5 паўночна-заходніх губернях, не ўлічваючы Ковенскай, служылі 4663 чыноўнікі не «польскага паходжання». Такім чынам, пасля паўстання 1863 г. царскі ўрад кардынальна змяніў рэлігійны склад чыноўніцкага корпуса ў беларуска-літоўскіх губернях. З 32 чыноўнікаў, якія займалі кіруючыя пасады ў губернскай адміністрацыі азначаных губерняў, 22 былі праваслаўнымі (68,75 %), 6 – лютэранамі (18,75 %) і толькі 4 – каталікамі (12,5 %). На замену адміністрацыйнага апарату былі выдаткаваны значныя фінансавыя сродкі. Толькі ў 1868 г. на дадатковыя выплаты чыноўнікам, якія прыехалі з Расіі, пайшло 650 тыс. руб. з сумы ўстаноўленага працэнтнага збору з маёнткаў памешчыкаў каталіцкага веравызнання[2].

У 60-я гады XIX ст. царызм устанавіў у беларуска-літоўскіх губернях рэжым выключных законаў і сістэму ваенна-паліцэйскага кіравання, мясцовая дзяржаўная адміністрацыя атрымала пашыраныя паўнамоцтвы. На яе была ўскладзена задача правядзення поўнай і канчатковай уніфікацыі краю з цэнтральнымі раёнамі.

**Арганізацыя судовых устаноў.** Адной з галоўных мэт царскага ўрада была інтэграцыя беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Для паскарэння дадзенага працэсу праводзілася і ўніфікацыя судовага апарату. Нягледзячы на тое, што першапачаткова царскі ўрад абвясціў, што суд і расправа будуць пакінуты на мясцовых правах[3], усё ж такі ў судовую сістэму былі ўнесены пэўныя змены.

Усе «судовыя месцы» падзяляліся на тры інстанцыі: ніжэйшую, сярэднюю і вышэйшую. Ніжэйшыя суды разглядалі як крымінальныя, так і грамадзянскія справы. Дваране судзіліся ў павятовых судах, мяшчане – у ратушах

[1] Тамсама. С. 70–76.

[2] Тамсама. С. 75.

[3] *Никотин И. А.* Столетний период (1772–1876) русского законодательства в воссоединенных от Польши губерниях и законодательство о евреях (1649–1876). Т. 1. С. 4.



Будынак мінскай ратушы (пачатак XIX ст.)

і магістратах, сяляне – у ніжэйшых расправах. Сярэднюю інстанцыю складалі верхнія земскія суды, губернскія магістраты, верхнія расправы. Кожны з гэтых судоў падзяляўся яшчэ на два дэпартаменты: адзін для грамадзянскіх, другі для крымінальных спраў. Вышэйшую інстанцыю складалі губернскія палаты грамадзянскага і крымінальнага суда, якія былі падпарадкаваны непасрэдна Сенату. У палаце грамадзянскага суда разбіраліся справы аб грашовай казне, аб размежаванні паветаў і гарадоў губерняў, туды прыходзілі звесткі аб колькасці насельніцтва. У палаце крымінальнага суда разглядаліся крымінальныя справы, якія паступалі на рэвізію, аб службовых злачынствах, а таксама справы аб калодніках. Справы вяліся на рускай і польскай мовах[1].

Судовыя ўстановы Расійскай імперыі кіраваліся калегіяльна. У сярэднія і ніжэйшыя інстанцыі ўводзіліся выбарныя ад саслоўяў. Вышэйшыя судовыя ўстановы складаліся выключна з урадавых чыноўнікаў, старшыні сярэдніх назначаліся ўрадам, засядацелі выбіраліся ад саслоўяў, у павятовых судах і гарадавых магістратах засядалі выбарныя ад саслоўяў. Для нагляду за выкананнем закону ўводзіліся ў прысутных месцах пасады павятовых страпчых. У губерні дзейнічаў губернскі пракурор і два губернскіх страпчых, у Сенаце – обер-пракурор. У павятовых гарадах ствараліся павятовыя суды, ніжэйшыя расправы, гарадавыя магістраты, сіроцкія і «совестные» суды, уводзіліся пасады губернскага пракурора, губернскіх і павятовых страпчых[2].

У грамадзянскім судаводстве дзейнічалі нормы Статута ВКЛ 1588 г. і сеймавых канстытуцый, справаводства вялося на польскай мове. Крымінальнае судаводства ажыццяўлялася згодна з агульнаімперскімі законамі і на рускай мове. Трэба адзначыць, што выкарыстоўваць Статут у поўным памеры не было

[1] *Бравер Е. Л.* К вопросу об истории судебных учреждений Белоруссии конца XVIII – первой половины XIX в. // Вопр. архивоведения и источниковедения в БССР. Минск, 1971. С. 464.

[2] Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917). Минск, 2006. С. 24.

ніякай магчымасці. Дзяржаўныя і крымінальныя справы падлягалі разгляду цэнтралізаваных устаноў, а справы асабістыя і маёмасныя разглядаліся ўтворанымі па расійскім ўзоры губернскімі і павятовымі земскімі судамі. Гэтыя суды разглядалі толькі грамадзянскія справы дваран. Як і ва ўсёй імперыі, суддзі выбіраліся з мясцовых дваран. Права выбару мелі ўсе тыя, у каго ва ўласнасці была маёмасць не меней за 10 душ прыгонных сялян мужчынскага полу[1].

Канкрэтную арганізацыю судаводства на месцах Кацярына II зацвердзіла 16 красавіка 1773 г., а адпаведныя штаты – 8 мая 1773 г. Згодна з гэтымі ўказамі ў кожнай правінцыі ствараўся земскі суд у складзе сямі чалавек, а ў губернях – губернскі земскі суд як апеляцыйная інстанцыя для першых. Ствараліся два губернскія і шэсць правінцыяльных земскіх судоў. Губернскі суд узначальваў прэзідэнт у чыне 6-га класа, якога назначаў Сенат. Дапамагалі яму чатыры члены 8-га класа, сакратар і тры пісары (у пскоўскім судзе было не чатыры, а тры члены). Паколькі Магілёў з'яўляўся адначасова сталіцай аднайменнай правінцыі, то тут не стварылі правінцыяльнага суда, справы якога падлягалі кампетэнцыі земскага суда губерні. У правінцыі земскі суд складалі прэзідэнт у чыне 8-га класа, тры члены 9-га класа, сакратар і два пісары, адпаведна колькасці папярэдніх земскіх судоў Рэчы Паспалітай. Увогуле з усіх 57–59 членаў земскіх судоў на 33 суддзі прыпадала 26 канцылярскіх служачых. У тым жа 1773 г., пры ўтварэнні паветаў у складзе правінцый, з'явіліся і павятовыя земскія суды на чале з земскімі спраўнікамі разам з трыма засядацелямі. Земскія суды ахоплівалі сваёй кампетэнцыяй усе тыя справы, якія паасобку вырашаліся ў ранейшых земскіх, гродскіх і падкаморскіх судах адносна валодання рухомай і нерухомай маёмасцю, закладных, пасагаў, прэтэнзій, гандлю, дараванняў, сялянскіх уцёкаў і г. д.

На судовыя сесіі былі адведзены чатыры месяцы: з 1 лістапада да 1 сакавіка. Бесперапынныя пасяджэнні змянілі чатырохразовыя сесіі, якія праводзіліся ў сакавіку, маі, верасні і снежні. У час сесій належала вырашаць справы, якія паступілі. Паміж сесіямі дзейнасць судоў насіла падрыхтоўчы характар: сакратар або пісар прымаў пісьмовыя прашэнні, рыхтаваў матэрыялы для чарговага пасяджэння[2].

Суддзі ўжо не ўтрымліваліся за кошт вырашаных спраў і з платы зацікаўленых бакоў, а пераводзіліся на грашовае ўтрыманне дзяржавы ў адпаведнасці з чынам па Табелі аб рангах і ў залежнасці ад службы або за час прысутнасці. Зносіны паміж урадавымі канцылярыямі і земскімі судамі па апеляцыйна-следчых справах выконваліся паасобку або раздзельна. Справаводства ў судах заставалася на польскай мове. Зносіны з адміністрацыйнымі інстанцыямі ўрада вяліся на рускай мове, дзеля чаго патрабаваліся перакладчыкі.

У гарадах судовыя функцыі выконвалі магістраты, якія былі перайменаваны ў гарадавыя магістраты. Яны да 1797 г. падначальваліся губернскім магіст-

[1] Национальные окраины Российской империи: становление и развитие системы управления. М., 1998. С. 199.

[2] *Анішчанка Я. К.* Беларусь у часы Кацярыны II. С. 68–70.

ратам, а з 1797 г. – галоўным судам абодвух дэпартаментаў. Бурмістры і лаўнікі выбіраліся на тры гады гарадскім купецтвам і мяшчанствам. Займаліся яны разборам крымінальных і грамадзянскіх спраў як па прыватныхісках, так і па ўказаннях дзяржаўных органаў улады. Справы вяліся на рускай і польскай мовах[1].

Павел I унёс цэлы шэраг змяненняў у структуру суда. Галоўнымі з іх былі скасаванне судоў другой інстанцыі (верхняга земскага суда, губернскага магістрата і верхняй земскай расправы), асаблівага саслоўнага суда для непрыгонных сялян першай інстанцыі (ніжэйшай земскай расправы) і «совестных» судоў і аб'яднанне двух мясцовых усесаслоўных судоў трэцяй інстанцыі (палаты крымінальнага і грамадзянскага судоў) у адзін вышэйшы мясцовы суд (у губернскую палату суда і расправы, якая падзялялася на крымінальны і грамадзянскі суд). Замяшчэнне пасады земскага камісара было дадзена кіраўніку губерні, гэта значыць ваеннаму губернатару. Новым загадам 11 лютага 1798 г. назначэнне і звальненне спраўнікаў даручалася грамадзянскім губернатарам. У далейшым дзеянне гэтых загадаў было распаўсюджана і на Беларускую, Мінскую, Валынскую, Падольскую і Кіеўскую губерні. У выдадзеных 31 снежня 1796 г. штатах Літоўскай, Беларускай, Мінскай губерняў загадвалася для ўсіх, акрамя Літоўскай, узнавіць у іх судовыя ўстановы: у губернскіх гарадах галоўныя суды, падзеленыя на два дэпартаменты, у паветах – земскія павятовыя і падкаморскія суды. Па гэтых штатах суд складаўся з двух прадстаўнікоў (для крымінальнага і грамадзянскіх дэпартаментаў), двух дарадчыкаў па назначэнні ад урада і шасці засядацеляў, якія выбіраліся шляхтай.

Земскі павятовы суд складаўся з земскага суддзі, двух земскіх падсудкаў ці асэсараў і земскага пісара. Падкаморскі суд складаўся з падкаморыя, каморніка і вознага. У кампетэнцыю адкрытых судоў уваходзілі не толькі грамадзянскія справы, як гэта было ў часы Рэчы Паспалітай, але і крымінальныя, што было наваўвядзеннем[2]. Што датычыцца губернскіх галоўных судоў, то па сваёй арганізацыі яны адрозніваліся ад агульнаімперскага выбарным шляхецкім складам засядацеляў.

Над гродскімі, земскімі і падкаморскімі судамі была зацверджана ўлада аднаўленага галоўнага Літоўскага трыбуналу. Ён павінен быў вырашаць свае справы ў Вільні і ў Гродне па паўгода. Скаргі на яго рашэнні павінны былі ісці ў Сенат. Акрамя пералічаных вышэй судоў загадам ад 6 лютага 1797 г. для Літоўскай губерні ў Вільні быў створаны асаблівы надворны суд для разгляду прывілеяў аб правах уладання, якія датычыліся гарадоў, староств[3]. 27 верасня 1797 г. такі ж суд з'явіўся ў Мінскай губерні, а 6 лістапада кампетэнцыя гэтай установы была пашырана. Надворны суд атрымаў права разгляду службовых злачынстваў чыноўнікаў. На пасаду старшыні галоўных судоў Мінскай,

[1] *Бравер Е. Л.* К вопросу об истории судебных учреждений Белоруссии конца XVIII – первой половины XIX в. С. 463.

[2] *Жукович П.* Западная Россия в период царствования императора Павла I. С. 205.

[3] *Никотин И. А.* Столетний период (1772–1876) русского законодательства в воссоединенных от Польши губерниях и законодательство о евреях (1649–1876). Т. 1. С.19.

Беларускай губерняў мясцовая шляхта выбірала трох-чатырох чалавек і праз кіраўніка губерні і Сенат рэкамендавала яго на зацвярджэнне імператару.

Увесь склад павятовых, падкаморскіх, галоўных судоў выбіраўся з асяроддзя мясцовай шляхты. У надворных судах палова службоўцаў таксама была выбарнай. Што датычыцца выбарных судовых дваранскіх пасад, то выбраны на пэўную пасаду займаў яе да сваёй смерці ці па той ці іншай прычыне (напрыклад, павышэнне па службе) адмаўляўся ад яе. Сенат пастанавіў выбіраць старшыню і засядацеляў галоўнага суда кожныя тры гады. Гарадавыя магістраты былі пакінуты на «старых правах».

Яшчэ адной асаблівасцю царавання Паўла I было ўвядзенне ў Мінскай і Літоўскай губернях пасады фіскала, зацверджанай 25 студзеня 1799 г., а ў Беларускай 5 мая 1799 г. У іх функцыі ўваходзілі агляд губернскіх прысутных месцаў, выяўленне злоўжыванняў уладай, аб якіх яны павінны былі праінфармаваць губернатара і генерал-пракурора Сената[1].

У сферы саслоўнага дваранскага і мяшчанскага судаводства праўленне Паўла I было часам саступак мясцоваму насельніцтву. Калі Кацярына II захавала ў беларуска-літоўскіх губернях судаводства для мяшчан і дваран на мясцовым праве (з некаторымі змяненнямі), выбарны склад дваранскіх судоў і польскую мову, то пры Паўле I аднаўлены суды ніжэйшай інстанцыі ў тым самым выглядзе і з тым самым судзейскім складам, з якім яны існавалі ў Рэчы Паспалітай.

Пасля паўстання 1830–1831 гг. Мікалай I пачаў «наступленне» на мясцовыя асаблівасці ў судовай сістэме з мэтай уніфікацыі іх з агульнарасійскімі. Ён загадаў усім прысутным месцам і службовым асобам у беларуска-літоўскіх губернях даць тыя найменні, якія адпавядалі б па Устанаўленні аб губернях месцам і службовым асобам у вялікарасійскіх губернях, а старыя – адмяніць назаўсёды. У першых дэпартаментах галоўных судоў, якія з гэтага часу насілі назву крымінальных палат, на пасады старшыні прызначаліся людзі, якіх прадстаўляла Міністэрства юстыцыі, пасля ўзгаднення з часовымі ваеннымі губернатарамі. Павятовыя гродскія суды былі перайменаваны ў павятовыя суды. Земскіх спраўнікаў і засядацеляў земскіх судоў трэба было выбіраць па рэкамендацыі грамадзянскіх губернатараў, але засядацелям, абраным дваранствам, давалася магчымасць застацца на сваіх пасадах. Паліцмайстраў і гараднічых, якім удвая павысілі жалаванне, таксама павінна было назначаць губернскае праўленне па рэкамендацыях губернатараў. Акрамя таго, губернскае праўленне мела магчымасць звальняць ці пакідаць на месцы ўжо працуючых службоўцаў дадзеных прафесій. Гэтыя загады распаўсюджваліся на Мінскую, Гродзенскую, Віленскую губерні. Беластоцкую вобласць было загадана далучыць да галоўнага кіравання часовага ваеннага губернатара віленскага і гродзенскага[2].

Указам ад 1 студзеня 1831 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях было адменена дзеянне Статута ВКЛ 1588 г. Указам ад 30 кастрычніка таго ж года

[1] *Жукович П.* Западная Россия в период царствования императора Павла I. С. 207.

[2] Гродненская губерния в законодательных актах Российской империи (1801–1913). Слоним, 2004. С. 60–61.

усім судовым установам і службовым асобам прысвойваліся тыя чыны, якія існавалі ў расійскіх губернях. Дэпартаменты Галоўных губернскіх судоў былі ператвораны ў крымінальныя і грамадзянскія палаты, гродскія суды былі ліквідаваны, а іх справы перадаваліся ў земскія павятовыя суды, якія атрымалі назву «павятовыя». Старшыняў крымінальных палат у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях загадана было прызначаць ад урада. Указам ад 25 чэрвеня 1840 г. было канчаткова скасавана дзеянне Статута на ўсёй тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў[1].

У выніку судовай рэформы 1864 г. у Расійскай імперыі саслоўныя суды былі заменены агульнымі для ўсіх саслоўяў судовымі ўстановамі. Замест шматлікіх судовых інстанцый ствараліся акружныя суды і судовыя палаты. Судовыя палаты займаліся апеляцыямі і разглядалі палітычныя справы. Для разбору дробных правапарушэнняў стварыўся прававы суд. Міравыя суддзі выбіраліся земствамі, а ў гарадах – гарадскімі думамі. Для сялян, па дробных грамадзянскіх і крымінальных справах, захоўваўся саслоўны валасны суд, уведзены рэформай 1861 г. У сваёй дзейнасці ён кіраваўся нормамі звычаёвага права[2]. Захаваўся і традыцыйны сельскі суд і суд старэйшых суседзяў, старасты, сельскага сходу, сямейны. Паступова назіралася тэндэнцыя да росту колькасці спраў, якія вырашаліся ў валасных судах. З павагай сяляне ставіліся і да агульнаграмадзянскага суда.

Судовая рэформа ў Беларусі была праведзена са значным спазненнем і адступленнямі ад палажэння 1864 г. У 1872 г. тут уведзены міравыя суды. Аднак заходнія губерні не мелі земскіх установ, на якіх, згодна з палажэннем 1864 г., выбіраліся міравыя суддзі. Таму на гэтыя пасады Міністрам юстыцыі прызначаліся тыя, у чыёй палітычнай надзейнасці была ўпэўнена мясцовая адміністрацыя. Такім чынам, судовая рэформа ў Беларусі была пазбаўлена адной з істотных уласцівасцей – выбарнасці суддзяў.

Акруговыя суды, судовыя палаты, пракуратура і адвакатура ў асобах прысяжных паверанных у беларускіх губернях таксама ўведзены са спазненнем, ужо пасля значнага звужэння царызмам судовай рэформы 1864 г. Толькі ў 1883 г. утворана Віленская судовая палата, якая стаяла на чале акруговых судоў Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губерняў. Акруговы суд Віцебскай губерні падпарадкоўваўся Пецярбургскай судовай палаце, Магілёўскай губерні – Кіеўскай судовай палаце[3].

Суд станавіўся адкрытым, галосным і незалежным ад урада. Адначасова ствараўся інстытут адвакатуры. Для засведчання розных актаў была ўведзена пасада натарыуса. Справы разглядаліся ў прысутнасці абвінавачанага, сведкаў і публікі. Суд выносіў прыгавор толькі ў адпаведнасці з вердыктам прысяж-

---

[1] *Никотин И. А.* Столетний период (1772–1876) руского законодательства в воссоединенных от Польши губерниях и законодательство о евреях (1649–1876). Т. 1. С. 29.

[2] *Забаўскі М. М., Рацько А. Ф.* Буржуазныя рэформы ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Мінск, 2004. С. 33.

[3] Гісторыя Беларусі. Т. 4. С. 173.

ных. Прысяжныя засядацелі – новыя дзеючыя асобы ў судовай структуры – зацвярджаліся мясцовымі ўладамі.

Судовая рэформа 1864 г. была значным крокам наперад у параўнанні з дарэформенным судом і адыграла значную ролю ў станаўленні буржуазных адносін у імперыі. Але істотнымі адступленнямі ад норм буржуазнага права з'яўляліся падпарадкаванне суддзяў губернатарам (1866 г.), перадача спраў аб палітычных злачынствах з суда прысяжных у судовыя палаты і ваенныя суды (1878 г.).

Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне часткі яе тэрыторыі да Расійскай імперыі, як і ўсталяванне новага адміністрацыйнага апарату, наклалі свой адбітак на развіццё беларуска-літоўскіх зямель. На далучанай тэрыторыі праводзілася цэнтралізатарская палітыка з мэтай зліцця яе з асноўнымі расійскімі рэгіёнамі. Тут ствараліся адміністрацыйныя органы і ўстановы па агульнарасійскім узоры. У часы Кацярыны II, Паўла I, Аляксандра I і Мікалая I праводзіліся адміністрацыйна-тэрытарыяльныя рэформы. Ключавыя пасады ў губернскай адміністрацыі аддаваліся чыноўнікам з цэнтральных расійскіх губерняў. Мясцовая шляхта атрымала правы расійскага дваранства, але пры ўмове прынясення прысягі на падданства Расіі і праверкі дакументаў, якія б пацвярджалі іх годнасць. На гэтыя землі была пашырана расійская падатковая сістэма, уведзена рэкруцкая павіннасць, скасавана магдэбургскае права, а на гарады і мястэчкі, прызначаныя цэнтрамі паветаў, пашыраны прынцыпы расійскага гарадскога самакіравання. Доўгі час тут дзейнічала і мясцовае заканадаўства, але ў абмежаваным выглядзе.

[1] Свод законов Российской империи (далее – СЗРИ). СПб., 1876. Т. 9. Ст. 169; СЗРИ. СПб., 1899. Т. 9. Ст. 80, 91.